**В. С. Забродская**

# ШЛЯХАМІ ЯКУБА КОЛАСА

Сёлета мы адзначаем 140-годдзе з дня нараджэння чалавека, які ўжо ў 1920 г. у «Гісторыі беларускай літаратуры», выдадзенай М. Гарэцкім, быў названы класікам. Сярод яго творчых поспехаў літаратуразнаўцы адзначаюць спалучэнне лірыкі і эпасу, закладанне асноў беларускага рамана і беларускай дзіцячай літаратуры, філасофскае адлюстраванне рэчаіснасці ў алегарычным апавяданні спрыянне фарміраванню норм беларускай літаратурнай мовы.

Творчасць Якуба Коласа ў цэлым вызначаецца няспынным развіццём і ўдасканальваннем. Пачаўшы пісаць вершы, ён перайшоў да алегарычных апавяданняў, эпасу, драм, раманаў. Таксама і кожнаму твору класіка ўласцівы рух. Канстанцін Міцкевіч сцвярджаў, што менавіта «дарога, вандроўка – самае лепшае лякарства ад усякіх напасцей». Таму вобраз «вечных дарог», які знайшоў сваё ўвасабленне ў творы «Новая зямля» пранізвае і злучае разам у адно цэлае шматлікія старонкі Коласавых твораў. Ахвотна выкарыстоўваюць даследчыкі-коласазнаўцы для акрэслення творчасці і біяграфіі лексемы *шлях/сцяжына жыцця/творчасці* (М. А. Тычына, М. І. Пратасевіч, М. А. Чырскі).

Чалавек жа прадстаўляецца Якубам Коласам *Часцінкай злітаю вялікага сусвету* («Я жыву», 1937), які *вітае шляхі дарогі*, бо *дарога ж многа з'яў хавае* («Рыбакова хата», 1941–1947). *Пры шляху шырокім, / Дзе стаіць камора, / Я на свет радзіўся / Пад глухі шум бору, / Позняю парою,* – піша Якуб Колас, згадваючы засценак Акінчыцы ў вершы «На раздарожжы» (1911). Як сцвярджаў Якуб Колас: «У кожным моманце з'яў прыроды для мяне ўсё было напоўнена глыбокай цікавасці і сэнсу, і кожны бачны элемент прыроды для мяне меў свой твар, сваю строга акрэсленую індывідуальнасць, сваё пэўнае жыццё, свядомае, адушаўлёнае».

Менавіта таму Колас заўсёды апісвае мясціну, дзе жыве яго персанаж яго твора, бо гэта мае значэнне, ад гэтага залежаць думкі, настрой, памкненні апошняга. Так, прыгадаем разважанні Лабановіча пра характар песні, што ён пачуў у в. Люсіна, куды прыехаў настаўнічаць: *Чаму мала разнастайнасці ў іх матывах?.. Ці не аднатоннасць тутэйшага краявіду, гэтыя доўгія, бясконцыя дарогі між лясоў і балот адбіліся на іх?* (У Палескай глушы, XIII).

*Многа дарог перамералі мае ногі,* – піша ў чарговым лірычным адступленні Якуб Колас у трылогіі «На ростанях».

Лексема *дарогі*, якая каля 70 разоў сустракаецца ў паэме «Новая зямля», каля 270 разоў – у трылогіі «На ростанях», з'яўляецца моўным складнікам злучэння прасторы і часу, яна – неад'емны элемент прасторы, бела-сінезялёнага ландшафту, абавязковы кампанент жыцця. Часта яе можна сустрэць у назвах вершаў («Дарогі» («Між палёў шырокіх...», 1906; «Між спелага жыта...», 1909); «З дарогі» («Дым бялявы, дым празрысты...», 1914; «Мінула шмат гадоў...», 1936), «Прайшоў я на свеце не мала дарог...», 1955; «Дзве дарогі», 1917; «Перад дарогай» («Эх, як тупну я нагою…», 1907), «У дарогу!», 1912); п'есы «На дарозе жыцця» (1917).

Дарога таксама прадстаўляецца элементам часу. Уключаная ў няспыннае кола часу, яна ўяўляе віток і спрыяе пераходу на новы ўзровень развіцця: прыгадаем радкі з «Новай зямлі»: *О, як бы я хацеў спачатку / Дарогу жыцця па парадку / Прайсці яшчэ раз, азірнуцца, / Сабраць з дарог каменні тыя, / Што губяць сілы маладыя, – / К вясне б маёй хацеў вярнуцца.*

Шлях Якуба Коласа і ў наш час працягваецца па зямлі. Плённа працуюць і радуюць сваіх шчырых наведвальнікаў супрацоўнікі Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа ў Мінску, які ў Сталбцоўскім раёне мае філіял, што ўключае мемарыяльныя сядзібы Акінчыцы, Альбуць, Ласток, Смольню; літаратурна-этнаграфічныя музеі ў сярэдніх школах Брэсцкай вобласці: в. Люсіна (Ганцавіцкі раён), в. Пінкавічы (Пінскі раён) і інш. У гэтых культурных установах ладзяцца цікавыя выставы і мерапрыемствы да памятных угодкаў, звязаных з жыццём і творчасцю класіка. У Коласаўскім заказніку (Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці) адкрыты мастацка-мемарыяльны комплекс «Шлях Коласа», які ўключае больш за 40 драўляных скульптур, зробленых па матывах твораў пісьменніка.

Вобраз Якуба Коласа натхняў таксама і майстроў выяўленчага мастацтва, сярод іх І. Ахрэмчык, Ю. Герасіменка, Л. Асядоўскі, М. Купава, Я. Раманоўскі, І. Рэй, У. Стальмашонак, В. Шаранговіч, Л. Шчамялёў і інш. Матэрыял пра жыццё і дзейнасць Якуба Коласа спрычыніўся да стварэння фільмаў («Народны паэт», 1952; «Якуб Колас», 1962 г.; «Дзядзька Якуб», 1982).

Творы Якуба Коласа натхнілі рэжысёраў на стварэнне тэатральных, кінематаграфічных (В. Гардзін, фільм «Песня вясны» – паводле аповесці «На прасторах жыцця», 1929; У. Корш-Саблін, фільм «Першыя выпрабаванні» – паводле трылогіі «На ростанях», 1960–1961), а кампазітараў – музычных твораў. Опера «У пушчах Палесся» створана Ю. Багатыровым па аповесці «Дрыгва», опера Ю. Семянякі – па паэме «Новая зямля».

Так, імя класіка беларускай літаратуры носяць Інстытут мовазнаўства, Цэнтральная навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, паліграфкамбінат у Мінску, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр у Віцебску, школы і бібліятэкі ў розных населеных пунктах нашай рэспублікі, плошчы і вуліцы, што знаходзяцца як у нашай краіне, так і за яе межамі.